**22.** Дадзены словы: *1) сумка; 2) сумаваць; 3) сумнявацца; 4) сумны*. Выберыце толькі тыя словы, якія з’яўляюцца аднакаранёвымі да слова ***сум***.
**А)** усе словы. **Б)** 1, 2, 3. **В)** 2, 4. **Г)** 3. **Д)** 3, 4.

**23.** Якія словы з прыведзеных няправільна падзелены для пераносу?
*1) збож-жа; 2) сям’-я; 3) май-скі;*
*4) бур-’ян; 5) пад-зем-ны; 6) дожд-жык.*
**А)** усе словы. **Б)** 1, 3, 5. **В)** 2, 4, 6. **Г)** 3, 5. **Д)** 4, 6.

**24.** Вызначце словы, у якіх замест кропак неабходна напісаць літару ***э***:
*1) ц..бар; 2) р..туал; 3) т..атр; 4) д..лікатны; 5) д..скусія.*
**А)** ва ўсіх словах. **Б)** 1, 3. **В)** 1, 2, 5. **Г)** 2, 4, 5. **Д)** 3, 4.

**25.** Выберыце з прапанаваных словы, якія з’яўляюцца сінонімамі да фразеалагізма ***што кіем па вадзе***: *1) ні за што ні пра што; 2) дарэмна; 3) старанна; 4) выдатна*.
**А)** усе словы. **Б)** 1, 3. **В)** 2. **Г)** 3, 4. **Д)** 4.

**26.** У якіх словах націск падае на другі склад?
*1) закутак; 2) кухонны; 3) брызент; 4) якісьці; 5) крамяны; 6) гладыш.*
**А)** ва ўсіх словах. **Б)** 1, 3, 4. **В)** 2, 4, 5. **Г)** 3, 5, 6. **Д)** 4, 6.

**27.** Хто з беларускіх асветнікаў з’яўляецца першадрукаром?
**А)** Сымон Будны. **Б)** Францыск Скарына. **В)** Васіль Цяпінскі.
**Г)** Афанасій Філіповіч. **Д)** Еўфрасіння Полацкая.

**28.** Якое лічбавае значэнне мела літара ***е*** ў старажытнасці?
**А)** «тры». **Б)** «чатыры». **В)** «пяць». **Г)** «шэсць». **Д)** «сем».

**29.** Як называецца тлумачальны слоўнік устарэлых і малазразумелых слоў пераважна да старажытных тэкстаў?
**А)** гласіс. **Б)** гласарый. **В)** сервіс. **Г)** спраўка. **Д)** даведка.

**30.** У якім сказе(-ах) правільна ўжыты дзеяслоў ***расчыніць***:
*1) Аленка прачнулася рана, расчыніла вочы і ўсміхнулася.*
*2) Гаспадыня вырашыла расчыніць вокны, каб праветрыць у кватэры.*
*3) Вучань расчыніў сшытак і пачаў запісваць заданне.*
*4) Расчыніліся нечакана насцеж дзверы ў пакой.*
*5) Сымонка вельмі хацеў расчыніць шкатулку і паглядзець на медаль?*
**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** 1, 3. **В)** 1, 3, 4. **Г)** 2, 4, 5. **Д)** 4, 5.

---

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб’яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3–218
тэл. (017) 292 80 31, 292 34 01, 290 01 53
e-mail: info@bakonkurs.by
http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 10. Тыраж 30800 экз. г. Мінск. 2009 г.

# Конкурс па беларускай мове «БУСЛІК-2009»

*Чацвер, 19 лютага 2009 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку.

---

## Заданне для вучняў 5-6 класаў

**1.** Колькі назоўнікаў ужыта ў вінавальным склоне ў вершаваных радках С. Маршака:
*Рэчы не ўзніклі самі:*
*людзі робяць іх рукамі.*
*Ручку, карандаш, пяро,*
*сшытак, парту, стол, акно,*
*кніжку, сумку беражы,*
*не запэцкай, не парві.*
**А)** няма такіх назоўнікаў. **Б)** 5. **В)** 7. **Г)** 9. **Д)** 11.

**2.** Хлопчыкі атрымалі заданне напісаць сачыненне, як яны працавалі ў майстэрні. Якія назвы прылад працы ім патрэбна выкарыстаць у пісьмовай рабоце?
*1) пенал; 2) абцугі; 3) мяч; 4) рубанак; 5) сякера.*
**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4, 5. **Д)** 3, 5.

**3.** Якую літару неабходна ўставіць замест пропуску ў словах вершаваных радкоў А. Дзеружынскага:
*Белай ко..драю пакрыта,*
*спачывае ..зімку жыта.*
*Сон чаро..ны жыту сніцца,*
*што яно ..жо каласіцца.*
**А)** в. **Б)** у. **В)** ў. **Г)** ф. **Д)** і.

**4.** З якіх слоў можна скласці сказы?
*1) У, Паўлік, лес, пайшоў.*
*2) Ягады, у, кошык, на, вядзерца, зверху, зямля.*
*3) Хлопчык, школу, прыйшоў, вясёлы, вельмі, у.*
*4) Па-над, з-за, цераз, толькі, напрасткі.*
*5) Чытаў, спяшаліся, каб, Янка, не хацеў, дадому, часопіс.*
*6) Раніца, вожык, ліст, грыбы, парк, знаходка.*
**А)** нельга скласці сказы з усіх прыкладаў.
**Б)** можна скласці сказы з усіх прыкладаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4, 6. **Д)** 3, 5.

**5.** У якіх словах з прыведзеных замест кропак неабходна напісаць літару ***т***?

*1) пара..; 2) сусе..; 3) кро..; 4) наро..; 5) патрыё..; 6) запаве.. .*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2, 4. **Г)** 2, 4, 6. **Д)** 3, 5, 6.

**6.** Дадзены словы: *1) шэпт; 2) шэптаць; 3) траск; 4) трашчала; 5) шчэбет; 6) шчэбятуха.* Якія словы з прыведзеных запісаны няправільна?

**А)** усе словы. **Б)** 1, 3, 5. **В)** 2, 4. **Г)** 2, 3, 6. **Д)** 3, 6.

**7.** Выберыце з прыведзеных словазлучэнні, у якіх выдзеленыя словы ўжыты ў пераносным значэнні?

*1) **густыя** пушчы; 2) **імклівыя** думкі; 3) **салодкі** цукар;*
*4) **прыродныя** багацці; 5) **глыбокі** роздум.*

**А)** 1, 3. **Б)** 1, 2, 4. **В)** 2, 5. **Г)** 2, 3, 5. **Д)** 3, 4.

**8.** Падбярыце да дзеясловаў *дзьме, свішча, працінае* патрэбны назоўнік.

**А)** гром. **Б)** дождж. **В)** вецер. **Г)** снег. **Д)** мароз.

**9.** Мікола летам часта хадзіў з дзядулем у лес. Бачыў там драпежных жывёл. Калі пісаў ліст сябру, то назвы іх зашыфраваў у рэбусе. Разгледзьце рэбусы і вызначце толькі назвы драпежных жывёл.

в = д 4 = н

1) 

а = ў 1, 2, 4, 3

2) 

м = я о = ц ʿ

3) 

1, 3, 2, 5, 4 ʿ

4) 

б = с а = ь

5) 

**А)** 1, 3. **Б)** 1, 3, 4. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 5. **Д)** 3, 4, 5.

**10.** Якія з прыведзеных назоўнікаў можна ўжываць як у множным, так і ў адзіночным ліку: *1) дзверы; 2) вароты; 3) двайняты; 4) грошы*?

**А)** усе назоўнікі. **Б)** дадзеныя назоўнікі маюць форму толькі множнага ліку.
**В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 4.

**11.** У якіх прыкладах замест кропак патрэбна ўставіць канчатак ***-ае***?

*1) Добр.. слова даражэйш.. за багацце.*
*2) Чуж.. розумам не пасыцееш.*
*3) Добр.. жалеза не ржавее, добры чалавек не забываецца.*
*5) Родн.. зямелька як змаранаму пасцелька.*
*6) Які розум, так.. і гаворка.*

**А)** 1, 3. **Б)** 1, 4. **В)** 2, 5. **Г)** 3, 6. **Д)** 5.

**12.** У якіх словах замест пропуску неабходна ўставіць літару ***в***?

*1) ..аконны; 2) На..уменка; 3) Ля..он; 4) ..азёрны; 5) ..абласны; 6) ..одпуск.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** 1, 3, 5. **В)** 2, 3, 6. **Г)** 3, 4, 5. **Д)** 4, 6.

**13.** Кожная казка мае сваю канцоўку. Як патрэбна закончыць выраз: *сталі яны жыцьпажываць ды ...*?

**А)** паехалі адпачываць. **Б)** нічога нанач не ўспамінаць.
**В)** сяброў нажываць. **Г)** дабра нажываць.
**Д)** у госці не ўсіх запрашаць.

**14.** Віця задумаўся над пытаннем, якое задаў настаўнік: *як адным словам можна назваць слоўнікавы запас пэўнай мовы*? Дапамажыце хлопчыку знайсці правільны варыянт.

**А)** сінтаксіс. **Б)** арфаграфія. **В)** фанетыка. **Г)** лексіка. **Д)** фразеалогія.

**15.** Янка для характарыстыкі свайго сябра ў сачыненні выкарыстаў прыметнікі: *1) дужы; 2) крыпкі; 3) знаходлівы; 4) дабры; 5) вясёлы.* Якія словы хлопчык запісаў няправільна?

**А)** у словах няма памылак. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 4. **Г)** 3. **Д)** 4, 5.

**16.** Аленка састаўляла красворд са словамі, якія называюць стравы. Якія словы з прыведзеных спатрэбяцца дзяўчынцы?

*1) дранікі; 2) грачанішча; 3) пярэбары; 4) верашчака; 5) рум.*

**А)** 1. **Б)** 1, 4. **В)** 2, 4. **Г)** 2, 3, 5. **Д)** няма такіх слоў.

**17.** Хто з'яўляецца аўтарам аповесці «Палескія рабінзоны»?

**А)** Якуб Колас. **Б)** Міхась Лынькоў. **В)** Янка Маўр.
**Г)** Уладзімір Караткевіч. **Д)** Янка Брыль.

**18.** Вызначце словы з прыведзеных, склад якіх адпавядае схеме «**прыстаўка+корань+суфікс+канчатак**»: *1) нагорны; 2) сям'я; 3) падвясны; 4) пад'езд; 5) хмаркі.*

**А)** няма такіх слоў. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 4. **Г)** 3, 5. **Д)** 4, 5.

**19.** Выберыце з прыведзеных пары слоў, якія з'яўляюцца антонімамі:

*1) гаварыць – маўчаць; 2) недасаліць – перасаліць;*
*3) радавацца – гараваць; 4) высока – нізка.*

**А)** усе пары слоў. **Б)** няма антонімаў. **В)** 1, 3, 4. **Г)** 2, 4. **Д)** 2, 3, 4.

**20.** Пра якую птушку ў народзе гавораць, што яна заўсёды просіць «*піць*»?

**А)** пра галку. **Б)** пра варону. **В)** пра сароку.
**Г)** пра кнігаўку. **Д)** пра ластаўку.

**21.** Вызначце слова, лексічнае значэнне якога дадзена няправільна:

*1) **жыллё** – месца, дзе жывуць людзі;*
*2) **жывіца** – тое, што надае каму-небудзь жывасць, прывабнасць, своеасаблівасць;*
*3) **дрыгва** – багністае топкае месца;*
*4) **знічка** – падаючая зорка.*

**А)** лексічнае значэнне ўсіх слоў запісана правільна.
**Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.